**МІНСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

пр. Незалежнасці, 8, 220030, г. Мінск
Тэл./факс (017) 218 00 90, 327 68 66
Р/р BY86BLBB36040100621571001001
у Дырэкцыі ААТ « Белінвестбанка »
па г. Мінску і Мінскай вобласці,
БІК BLBBBY2X

**МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

пр. Независимости, 8, 220030, г. Минск
Тел./факс (017) 218 00 90, 327 68 66
Р/с BY86BLBB36040100621571001001
в Дирекции ОАО « Белинвестбанка »
по г. Минску и Минской области,
БИК BLBBBY2X

25.10.2022 № 6-7-6184эл

На № ___________ ад ___________________

Аб разглядзе звароту

Паважаная !

Мінскі гарвыканкам (далей – Мінгарвыканкам) разгледзеў электронны калектыўны зварот ад 11.10.2022 № 6-7-6184 і паведамляе наступнае.

Згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14.05.2007 № 578 «Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцяў» комплекс касцёла святога Сымона і святой Алены, у які ўваходзяць касцёл святога Сымона і святой Алены, домік настаяцеля, вітражы касцёла святога Сымона і святой Алены, кампазіцыя «Звон Нагасакі», з'яўляецца каштоўнасцю другой катэгорыі рэспубліканскага значэння.

У адпаведнасці з рашэннем Мінгарвыканкама ад 28.11.2013 № 2995 «Аб прыняцці маёмасці ва ўласнасць г.Мінска» названыя будынкі прыняты ў гаспадарчае вядзенне КУП «Мінская спадчына» і перададзены па дамове бязвыплатнага карыстання рэлігійнай абшчыне «Рымска-каталіцкая парафія касцёла святога Сымона і святой Алены» (далей – абшчына). Уласнікам зямельнага ўчастка з'яўляецца КУП «Мінская спадчына».

У будынку касцёла 26.09.2022 г. у выніку ўзгарання агнём пашкоджана маёмасць. Пацярпелых няма.

На пазачарговым пасяджэнні камісіі па надзвычайных сітуацыях пры адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска 30.09.2022 было прынята рашэнне аб забароне эксплуатацыі культавага аб'екта.

Гэта мера звязана з неабходнасцю забеспячэння бяспекі людзей, якія прыходзяць у будынак касцёла, і захавання комплексу будынкаў, які

з'яўляецца аб'ектам гісторыка-культурнай спадчыны і знаходзіцца пад абаронай дзяржавы.

У будынку касцёла адключана электра-, цепла-, водазабеспячэнне. Усе названыя сістэмы патрабуюць рамонтна-аднаўленчых работ, пералік якіх вызначыцца пасля дэталёвага абследавання, па выніках якога будзе распрацавана праектная дакументацыя і выкананы адпаведныя работы. Да завяршэння абследавання комплекс будынкаў выведзены з эксплуатацыі.

Такім чынам, забеспячэнне выканання абавязацельстваў паміж КУП «Мінская спадчына» і абшчынай па дагаворы бязвыплатнага карыстання у такіх памяшканнях не з'яўляецца магчымым.

У адрас абшчыны ад КУП «Мінская спадчына» было накіравана паведамленне пра неабходнасць вызвалення памяшканняў касцёла ад рухомай маёмасці для магчымасці правядзення рамонтна-аднаўленчых работ.

Рамонтна-аднаўленчыя работы праводзяцца ў рамках устаноўленых норм і ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь 18.07.2011 № 300-З «Об обращениях граждан и юридических лиц» гэты адказ можа быць абскарджаны ў судзе ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку.

Намеснік старшыні А.М.Цуран

11. Каверына 218 02 92